Газета Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта www.gazeta.bsu.by

# УНІВЕРСІТЭТ

*Пераможца V Нацыянальнага конкурсу друкаваных СМІ «Залатая літара» ў намінацыі «Найлепшая шматтыражная газета»*

28 лютага 2014 года, № 3 (2106)

УРАЧЫСТАСЦІ

У БДУ дадзены старт цыклу мерапрыемстваў, прысвечаных **70-годдзю вызвалення Беларусі ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў.**

# «Мы – нашчадкі Перамогі!»




Фота Марыны БЕГУНКОВАЙ

*Перамога застанецца ў сэрцах людзей і праз пяцьдзясят, і праз сто гадоў*

Патрыятычная акцыя «Мы – нашчадкі Перамогі!» прайшла ва ўрачыстых абставінах напярэдадні свята Дня абаронцы Айчыны. З уступным словам перад ветэранамі Вялікай Айчыннай вайны, воінамі-інтэрнацыяналістамі і ветэранамі Узброеных Сіл Рэспублікі Беларусь, студэнтамі і супрацоўнікамі выступілі рэктар БДУ акадэмік Сяргей Абламейка і першы прарэктар Міхаіл Жураўкоў.

Адзначым, афіцыйнай частцы мерапрыемства папярэднічала тэматычная выстава, якая аднавіла гістарычны антураж ваеннага часу. У экспазіцыі былі прадстаўлены рарытэтныя прадметы і рэчы часоў Вялікай Айчыннай вайны: карты, радыёпрыёмнікі, тэлефоны, зброя, адзенне, прадметы ўжытку... Гасцей і супрацоўнікаў ВНУ ў стылізаванай форме салдат рабоча-сялянскай Чырвонай Арміі 1941 і 1943 гадоў сустракалі члены сталічнага клуба рэканструкцыі «Браты па зброі».

Арганізатарамі гэтага святочнага мерапрыемства выступілі Упраўленні выхаваўчай работы з моладдзю і па справах культуры БДУ.

У перспектыве ў БДУ плануецца правесці больш за 70 разнапланавых мерапрыемстваў, прысвечаных подзвігу савецкіх людзей у ваенныя гады. Сярод іх: міжнародная студэнцкая алімпіяда па гісторыі, анлайн-конкурсы, мультымедыйныя прэзентацыі, сустрэчы студэнцкіх моладзевых арганізацый БДУ з ветэранамі ВАВ, Узброеных Сіл Беларусі, воінамі-інтэрнацыяналістамі і інш. Акцыі нацэлены на выхаванне патрыятызму і грамадзянскасці ў студэнцкай моладзі.

Галоўнай падзеяй акцыі стала прэзентацыя незвычайнага сувеніра – **настольнага рэтракалендара**. Гэты падарунак героям і ветэранам Вялікай Айчыннай вайны – былым студэнтам і супрацоўнікам БДУ. На кожнай старонцы календара стылізаваная мізансцэна на чорна-белым здымку будынкаў і навучальных карпусоў БДУ даваеннага і ваеннага часу. Героямі і «персанажамі» каляндарных месяцаў выбраны найлепшыя студэнты. Імі сталі 12 пераможцаў і лаўрэатаў конкурсу «Студэнт года БДУ–2013». Маладыя людзі з дапамогай ваеннага рэквізіту змаглі адчуць і данесці атмасферу тых суровых гадоў. Адзначым, антуражная фотаздымка праходзіла ў павільёне Нацыянальнай кінастудыі «Беларусьфільм», а салдацкая форма, якую прымерылі нашы героі, выкарыстоўвалася ў многіх знакавых кінастужках пра вайну.

Нашы суразмоўцы – студэнт 4 курса фізічнага факультэта Канстанцін Жук і пяцікурснік факультэта міжнародных адносін Вадзім Пранько – на старонках рэтракалендара прадстаўлялі студзень і сакавік адпаведна. Кожны месяц адкрываў эпіграф, напісаны студэнтам. Так, будучы фізік напісаў: «Мне пашанцавала жыць у мірны час на мірнай зямлі. Але я ніколі не забуду подзвігі сваіх дзядоў, дзякуючы якім гэта магчыма!» А будучы дыпламат: «Я ўпэўнены, што Перамога застанецца ў сэрцах людзей і праз пяцьдзясят, і праз сто гадоў. Менавіта ёй мы абавязаныя ўсім, што маем цяпер».

**Бліц-інтэрв'ю з галоўнымі «персанажамі» старонак календара.**

***– «Малюючь хлапчыкі вайну» – калісьці папулярная песня кампазітара Багаслоўскага відавочна не пра нашых сучаснікаў. Цяперашнія хлапчукі гуляюць у камп'ютарныя гульні, у дварах ужо не крычаць «ура» і не гуляюць у «вайнушку».***

**Канстанцін Жук:** У вас недакладная інфармацыя. У пэўным узросце ўсе хлапчукі хочуць быць пераможцамі і абаронцамі. Я, напрыклад, з сябрамі гуляў у вайну.

**Вадзім Пранько:** І я таксама гуляў. Мне здаецца, незалежна ад часу, ад дзяржаўнага і сацыяльнага ўкладу ў памяці заўсёды будзе жыць подзвіг нашых суайчыннікаў у Вялікай Айчыннай вайне. Падкрэслю, ваенныя бітвы і танкавыя атакі мы таксама малявалі ў альбомах.

***– Многія маладыя людзі сцвярджаюць, што калі чуюць нямецкую гаворку, то асацыятыўна ўспамінаюць Вялікую Айчынную вайну з мастацкіх фільмаў. У вас ёсць падобныя асацыяцыі?***

**К. Жук:** У мяне такіх агрэсіўных паралеляў на фоне нямецкай мовы не ўзнікае. Няма негатыўнага стаўлення да сучаснай Германіі. Хутчэй, у такія моманты я ўспамінаю пра доблесць нашых салдат, подзвіг усяго савецкага народа. Успамінаю апавяданні бабулі і дзядулі, якія перажылі гэтую вайну. Калі пачалася вайна, яны былі яшчэ падлеткамі, жылі ў вёсцы пад Любанню. І, натуральна, у войску не служылі. Але той суровы час памятаюць: у іх вёсцы размяшчаліся салдаты нямецкай арміі. У нашай сям'і воінская доблесць і гонар афіцэра – не пафасныя словы. Мой бацька – ваенны чалавек, удзельнік баявых дзеянняў у Афганістане, мама заўсёды працавала ў вайсковай часці. Яна ведае ўклад жыцця ваеннага гарадка, ведае цану трывогі. Напэўна, таму памятныя даты мае родныя шанавалі асабліва. 9 мая мяне часта вадзілі на парад ваеннай тэхнікі. Я бачыў і запомніў урачыстае шэсце ветэранаў Вялікай Айчыннай вайны.

**В. Пранько:** Хоць у маёй сям'і прафесійных вайскоўцаў не было, але памятныя даты вайны з фашысцкімі захопнікамі ўшаноўваюць. Вайну перажылі толькі мае два прадзеды... Іншыя блізкія нарадзіліся ўжо пасля вайны, але кожны год 9 Мая – гэта той дзень, тое свята, калі ўся сям'я публічна і негалосна ганарыцца мінулым свайёй краіны. Калі мы ўсведамляем, хто мы і каму абавязаны мірным жыццём. І гэта, паверце, таксама не пафасныя словы. Я чамусьці ўпэўнены, што і праз 20 гадоў новае пакаленне будзе думаць таксама і трапятліва ставіцца да загінулых герояў Вялікай Айчыннай вайны.

***– Якія творы мастацтва і літаратуры вас асабліва ўразілі?***

**К. Жук:** Фільм Ігара Угольнікава «Брэсцкая крэпасць». Наколькі мне вядома, сцэнар засноўваўся на гістарычных фактах, а галоўныя героі фільма маюць рэальныя гістарычныя прататыпы.

**В. Пранько:** Раман Юльяна Сямёнава «Сямнаццаць імгненняў вясны». Вядомы серыял я ні разу і не бачыў.

***– Поспехаў вам!***

**Гутарыла Жанна ВАСАНСКАЯ**

## Чытайце ў нумары:

**«РЭЗЕРВІСТЫ» СПАСЦІГАЛІ ВЭБ-РЭСУРСЫ**
Навучальная праграма павышэння кваліфікацыі школы лідараў прайшла з 3 па 7 лютага ў БДУ
Стар. 2

**ДЗІВОСНАЕ ПОБАЧ**
Форум моладзевай навукі ўпершыню прайшоў у БДУ. Акрамя таго, быў праведзены фінал конкурсу «Belarus Science and Engineering Fair»
Стар. 3

**ПРАКЛАДЗЕНЫМ ШЛЯХАМ ДА ПОСПЕХУ**
Каманда Ліцэя БДУ зноў у фінале конкурсу «CanSat у Расіі»
Стар. 4

**НА ЎКЛАДЫШЫ ГАЗЕТЫ**
чытайце цікавосткі ад Псіхалагічнай службы БДУ

## Весткі з рэктарата

ГАНАРОВАЙ граматай Савета Міністраў Рэспублікі Беларусь узнагароджаны прарэктар па навуковай рабоце Алег Івашкевіч. Ён адзначаны за шматгадовую плённую навукова-педагагічную дзейнасць, значныя дасягненні ў галіне навуковых даследаванняў і асабісты ўклад у іх практычную рэалізацыю.

Таксама Ганаровай граматай Савета Міністраў Рэспублікі Беларусь узнагароджана загадчыца кафедры батанікі біялагічнага факультэта БДУ Валянціна Палікеснава. Яна адзначана за шматгадовую плённую навукова-педагагічную дзейнасць, значны ўклад у падрыхтоўку высокакваліфікаваных спецыялістаў.

* * *

НАДЗВЫЧАЙНЫ і Паўнамоцны Пасол Славацкай Рэспублікі ў Беларусі Мірaслаў Мойжыта наведаў 14 лютага гістарычны факультэт. На сустрэчы з выкладчыкамі і студэнтамі абмеркоўваліся пытанні супрацоўніцтва Беларусі і Славакіі ў розных сферах.

* * *

АДУКАЦЫЙНАЯ дзейнасць БДУ была прадстаўлена з 26 па 28 лютага на 12-й міжнароднай спецыялізаванай выставе адукацыйных паслуг «Адукацыя і кар'ера». На нашым стэндзе была размешчана поўная інфармацыя пра факультэты і адукацыйныя інстытуты, спецыяльнасці і спецыялізацыі, правілы прыёму, кошты платнага навучання. Акрамя таго, экспазіцыя распавядала пра магчымасці кар'ернага росту, перападрыхтоўкі і пра курсы павышэння кваліфікацыі. Не засталіся без увагі і сёлетнія абітурыенты, якім супрацоўнікі БДУ аказалі кансультацыйную дапамогу ў выбары будучай прафесіі.

**Паводле інфармацыі прэс-службы БДУ**

ШКОЛА ЛІДАРА

# «РЭЗЕРВІСТЫ» СПАСЦІГАЛІ ВЭБ-РЭСУРСЫ

**«Сістэма прафесійных кампетэнцый сучаснага лідара ў сферы навукі і адукацыі»** – пад такой назвай стартавала навучальная праграма павышэння кваліфікацыі школы лідараў, якая прайшла з 3 па 7 лютага ў БДУ.


Фота Аляксандра СНАПКА

На гэты раз «яўка» для выкладчыкаў была «абавязковай», ды і арганізацыя праграмы спецыяльна была запланавана на канікулярны перыяд, калі тыя не загружаны лекцыямі і могуць заняцца сваім асабістым прафесійным ростам. Удзельнікі школы лідара ўпершыню атрымалі пасведчанне аб павышэнні кваліфікацыі дзяржаўнага ўзору.

Нагадаем, што ў чэрвені мінулага года ўпраўленне кадраў таксама выступала каардынатарам такога мерапрыемства і сабрала супрацоўнікаў, якія ўключаны ў рэзерв кіраўнічых кадраў БДУ. *Наталля Няпеўная*, начальнік упраўлення кадраў, патлумачыла, што навучальную праграму павышэння кваліфікацыі складалі, улічваючы пажаданні «рэзервістаў», выказаныя падчас працы мінулай школы лідараў. Было высветлена, што маладыя выкладчыкі хочуць у першую чаргу ўдасканаліць свае прафесійныя навыкі, а некаторыя з іх нават імкнуцца атрымаць новую кваліфікацыю. Большасць выступіла за асваенне новых метадаў, тэхналогій і элементаў прафесійнай дзейнасці.

Прафесійныя кампетэнцыі сучаснага навукоўца-лідара на пачатку працы школы лідара 2014 года акрэсліў у сваім выступленні першы прарэктар Міхаіл Жураўкоў.

Зразумела, што новае ў працы выкладчыка і навукоўца апошнім часам звязана з выкарыстаннем IT-тэхналогій і камп'ютарызацыяй навучальнага працэсу. Таму найбольшую цікавасць сёлета выклікала лекцыя-семінар, якая пазнаёміла прысутных з тэхналогіямі стварэння электроннага вучэбна-метадычнага комплексу (ЭВМК). Да ўсяго «рэзервістам» расказалі пра такі новы сродак камунікацыі, як вэбінар, які можа стаць эфектыўным у навучанні і навукова-даследчай дзейнасці. Усяму гэтаму пастаралася навучыць дацэнт кафедры інфармацыйных тэхналогій Рэспубліканскага інстытута інавацыйных тэхналогій БНТУ *Ірына Стралкова*. Стварэць электроннае партфоліа і надаваць належную ўвагу навукаметрычным паказчыкам даў параду на сваіх практычных занятках намеснік начальніка аддзела інфармацыйна-аналітычнага і тэхналагічнага забеспячэння адукацыйнай дзейнасці БДУ *Уладзімір Галынскі*.

Асаблівасцю сёлетняга мерапрыемства стала відэалекцыя на тэму адкрытай адукацыі, якую правёў член праўлення Еўрапейскай асацыяцыі па якасці электроннай адукацыі (EFQUEL) *Алістэр Крылман* (Швецыя). Пра ролю вэб-сэрвісаў у працы выкладчыка расказаў начальнік медыяцэнтра БДУ дацэнт кафедры тэхналогій камунікацый факультэта журналістыкі *Павел Салаўёў*. Дарэчы, для таго, каб мець магчымасць працаваць з матэрыяламі, «рэзервісты» сёлета захапілі з сабой на заняткі партатыўныя камп'ютары і іншыя гаджэты.

Пытанні абароны аўтарства навуковых распрацовак турбавалі маладых выкладчыкаў і навукоўцаў яшчэ на мінулай школе лідара. Таму праблемам прававой аховы вынікаў навуковай дзейнасці быў прысвечаны круглы стол, на які былі запрошаны лектары прававых дысцыплін з БДУ, а таксама вядучы навуковы супрацоўнік Нацыянальнага цэнтра заканадаўства прававых даследаванняў Рэспублікі Беларусь *Сяргей Лосеў* і галоўны спецыяліст аддзела аўтарскіх і сумежных правоў упраўлення права і міжнародных дамоў Нацыянальнага цэнтра інтэлектуальнай уласнасці *Кацярына Янцікава*.

Усім удзельнікам школы лідара прыйшліся даспадобы трэнінгі. Яны якраз і рыхтавалі іх да кіраўнічых пасад. Спадабаўся семінар-трэнінг «Кейс-метад: як ствараць і эфектыўна выкарыстоўваць кейсы» дацэнта кафедры агульнай і клінічнай псіхалогіі БДУ *Алега Радзюка*, які выступаў перад такой аўдыторыяй у другі раз. Цёпла сустрэлі слухачы яшчэ аднаго знаёмага лектара, коўч-кансультанта *Уладзіміра Глушакова*, які працуе дацэнтам кафедры эканомікі прадпрымальніцтва і права ІПКПЭК БДЭУ. Яго семінар-трэнінг быў прысвечаны метадам кіравання канфліктамі, а таксама міжасабовым і прафесійным камунікацыям кіраўніка.

Сёлета ўпраўленне кадраў упершыню арганізавала комплексную псіхадыягностыку адміністратыўнага патэнцыялу «рэзервістаў», якая павінна дапамагчы ў будучыні правільна падабраць і рацыянальна расставіць кадры.

Апытанне сярод удзельнікаў мерапрыемства дало магчымасць арганізатарам высветліць, як тыя ацэньваюць пабудову навучальную праграму школы лідара. Больш за палову рэспандэнтаў ацанілі яе высока і адказалі, што змогуць выкарыстаць атрыманыя веды ў сваёй практычнай дзейнасці. Многім з іх спадабаўся вэбінар «Адкрытая адукацыя», а таксама трэнінг кіравання канфліктамі. Новую навучальную праграму «Сістэма прафесійных кампетэнцый сучаснага лідара ў сферы навукі і адукацыі» большасць «рэзервістаў» (38,3 %) ацаніла на «васьмёрку», некаторыя (25 %) паставілі складальнікам праграмы «дзявятку». Былі і тыя (3,33 %), хто паставіў «дзясятку». Арганізатараў гэта вельмі абнадзеіла. І яны засведчылі: «Школе лідара быць і надалей».

**Ганна ЛАГУН**

МАНІТОРЫНГ

# Арганізатар ці выканаўца? Пакажа тэст

Слухачы сёлетняй школы лідара змаглі прайсці **комплексную дыягностыку адміністрацыйнага патэнцыялу** ў «Рэспубліканскім цэнтры праблем чалавека» БДУ. У чым яна заключалася, мы папрасілі расказаць загадчыцу лабараторыі псіхафізіялогіі і прафесіяграфіі гэтага цэнтра Святлану САГАЙДАК.

***– Святлана Станіславаўна, наколькі запатрабаваны метадычны інструментарый, які выкарыстоўвае ваша лабараторыя?***

– Наш калектыў псіхолагаў і праграмістаў за апошнія 20 гадоў плённа супрацоўнічаў з рознымі заказчыкамі: Міністэрствам адукацыі, Дырэкцыяй будаўніцтва атамнай станцыі Міністэрства энергетыкі, Дэпартаментам па санацыі і банкруцтве Міністэрства эканомікі, Міністэрствам юстыцыі, Міністэрствам спорту, Міністэрствам унутраных спраў, Міністэрствам па надзвычайных сітуацыях і іншымі. Для кожнай прафесійнай групы мы выкарыстоўвалі спецыфічныя сродкі, свой набор прафесійна важных якасцяў. Галоўная праблема кадравых службаў для адказных відаў дзейнасці: прагноз прафесійнай надзейнасці. Яе базавымі прыроджанымі задаткамі з'яўляюцца працаздольнасць, стрэсаўстойлівасць, здольнасць да навучання. Мы выяўляем індывідуальны стыль дзейнасці ў сітуацыі вострага стрэсу, пры доўгай напружанай рабоце, у манатонных руцінных умовах.


*Святлана САГАЙДАК*

Выяўленне адміністрацыйнага патэнцыялу – таксама найважнейшая задача кіраўнічай іерархіі любой арганізацыі. Ініцыятарам правядзення комплекснай псіхадыягностыкі адміністрацыйнага патэнцыялу ў БДУ стала ўпраўленне кадраў. Менавіта ў яго абавязкі ўваходзіць забеспячэнне падбору і рацыянальнай расстаноўкі кадраў у нашым універсітэце. Задаткі адміністрацыйных здольнасцяў мы ацэньваем пры дапамозе комплексу спецыяльных тэстаў.

***– Што такое адміністрацыйны патэнцыял? Ён напрацоўваецца з гадамі, ці трэба, каб чалавек валодаў пэўнымі якасцямі ўжо з нараджэння?***

– Адміністрацыйны патэнцыял – гэта сукупнасць прыроджаных якасцяў і напрацаванага вопыту камунікацый, сацыяльных сувязяў і г. д. Вопыт, зразумела, прыходзіць з цягам часу, а вось прыроджаны рэсурс не мяняецца. Надзвычай важна выявіць гэты рэсурс, таму што часцяком рэальныя рамкі прыроджаных здольнасцяў не ўсведамляюцца нават самім чалавекам. У пастаянных стрэсавых умовах недахоп адміністрацыйнага патэнцыялу можа дорага абысціся і адміністратару (страта здароўя ад нервовага напружання), і арганізацыі ў цэлым (ненадзейнасць у працы ўсяго калектыву і інш.). Адметна, што адміністрацыйны патэнцыял ва ўстанове вышэйшай адукацыі звычайна цесна пераплятаецца з высокімі інтэлектуальнымі характарыстыкамі асобы.

***– Якімі асабістымі характарыстыкамі павінен валодаць адміністратар ВНУ? Ці ёсць, згодна з вашым тэстам, будучыя кіраўнікі сярод кадравага рэзерву БДУ?***

– Хачу пачаць з сутнасці псіхадыягностыкі адміністрацыйнага патэнцыялу. У нашым дыягнастычным класе прыкладна за 2,5–3 гадзіны можна прайсці каля паўтара дзясятка тэстаў. Па выніках такой комплекснай дыягностыкі ацэньваецца 14 якасцяў, якія садзейнічаюць эфектыўнай адміністрацыйнай дзейнасці. Сярод іх – камунікатыўныя здольнасці, гнуткасць у зносінах, захаванне эфектыўнасці працы ў стрэсавых абставінах, высокая працаздольнасць пры доўгай напружанай працы, здольнасць вылучаць істотную інфармацыю, бачыць узаемасувязі паміж падзеямі і г. д.

Акрамя гэтага, выяўляюцца і 9 якасцяў, якія ўскладняюць адміністрацыйную дзейнасць: напрыклад, высокая імпульсіўнасць пры стрэсавых абставінах, агрэсіўны, канфліктны стыль узаемадзеяння ў зносінах, цяжкасці ў прыняцці рашэнняў у сітуацыі, якая хутка мяняецца, і іншыя. Кожная якасць ацэньваецца па трохбальнай сістэме. Прычым, калі прыроджаных перадумоў для пэўных якасцяў не выяўлена, то і ацэнак па ім можа не быць. Вынік выглядае наступным чынам: пералік 14 станоўчых і 9 адмоўных якасцяў з ацэнкамі, ніжэй – абагульненыя паказчыкі адміністрацыйнага патэнцыялу ў балах. Аднак сярод набору якасцяў ёсць пераважна арганізатарскія і пераважна выканаўчыя. Напрыклад, пра 46 супрацоўнікаў БДУ, якія пратэсціраваліся ў нашым дыягнастычным класе, можна сказаць што ўсе яны валодаюць адміністрацыйным патэнцыялам. Толькі хтосьці больш прыдатны для арганізатарскай дзейнасці, а камусьці лепш падыдуць выканаўчыя функцыі. Таму мы абавязкова даём і прагноз накіраванасці на арганізатарскую ці выканаўчую сферу дзейнасці ў працэнтных суадносінах.

***– Добры адміністратар цэніцца ва ўсіх арганізацыях. Ці варта адчайвацца, калі тэсты гавораць, што табе наканавана быць у падначаленых?***

– Тэрмін «падначалены» ў першую чаргу адлюстроўвае сацыяльную ацэнку службовых абавязкаў супрацоўніка. Быць падначаленым, або «пад чынам», многім не падабаецца. Таму ў гэтым выпадку лепш выкарыстоўваць тэрмін «выканаўца», гэта значыць чалавек, які даводзіць задачу, пастаўленую арганізатарам, да лагічнага завяршэння. Яксны падбор кадраў якраз і заключаецца ў тым, каб удала скласці пару «арганізатар – выканаўца», якая будзе затым зладжана працаваць. У кожнага дэкана заўсёды ёсць надзейныя і талковыя намеснік, здольны на высокім узроўні выконваць яго распараджэнні. Тут важна, каб кожны з іх быў на сваім месцы і мог выкарыстаць свой індывідуальныя прыроджаны патэнцыял.

**Гутарыла**
**Ганна ЛАГУН**

КОМПАС АБІТУРЫЕНТА

# Дзівоснае побач

**Форум моладзевай навукі упершыню прайшоў 22 лютага ў БДУ.** Акрамя таго, быў праведзены фінал навукова-інжынернага конкурсу навучэнцаў **«Belarus Science and Engineering Fair».**



Фота Генадзія КРАСКОЎСКАГА

Форум моладзевай навукі – прафарыентацыйнае мерапрыемства для навучэнцаў школ, ліцэяў і гімназій. Накіраванае яно на развіццё даследчай дзейнасці моладзі, папулярызацыю фундаментальнай навукі і інавацыйных дасягненняў навукоўцаў, прыцягненне матываваных абітурыентаў на прыродазнаўчанавуковыя спецыяльнасці БДУ.

З вітальным словам выступілі першы прарэктар БДУ Міхаіл Жураўкоў, дырэктар адміністрацыі Парка высокіх тэхналогій Валерый Цапкала і прарэктар па навукова-метадычнай рабоце Мінскага абласнога інстытута развіцця адукацыі Марына Краснова.

Для школьнікаў была падрыхтаваная вялікая відовішчная праграма з прэзентацыяй навуковай дзейнасці факультэтаў БДУ. Юных даследчыкаў чакалі на ФПМІ, ФРКТ, біялагічным, геаграфічным, механіка-матэматычным, хімічным і фізічным факультэтах. Для іх быў арганізаваны больш за дзясятак навукова-пазнавальных лекцый і дэманстрацыйных навуковых выпрабаванняў. Незабыўным стала наведванне Цэнтра аэракасмічнай адукацыі БДУ, унікальных музеяў біялагічнага і геаграфічнага факультэтаў, навучальна-навуковых лабараторый фізічнага і хімічнага факультэтаў.

Акрамя таго, 22 і 23 лютага БДУ стаў пляцоўкай для правядзення фіналу навукова-інжынернага конкурсу навучэнцаў «Belarus Science and Engineering Fair». Арганізатарамі навуковага спаборніцтва выступілі ПВТ, карпарацыя Intel, МАІРА і ўпраўленне адукацыі Мінскага абласнога выканаўчага камітэта. Свае навуковыя працы і праекты прадставілі фіналісты конкурсу – 90 школьнікаў з усіх абласцей краіны. Юныя навукоўцы падрыхтавалі даследаванні па біялогіі, экалогіі, энергазахавальных тэхналогіях, хіміі, інфарматыцы, матэматыцы, фізіцы, электратэхніцы і механіцы.

Перад фіналістамі стаяла задача стэндавай абароны сваіх праектаў. Для вызначэння пераможцы ўлічваліся ўменне навучэнцаў камунікаваць, лагічна думаць, адстойваць уласны пункт гледжання.

Па выніках выступлення вызначаныя найлепшыя праекты, аўтары якіх прадставяць Беларусь на міжнародным навукова-інжынерным конкурсе «Intel International Science and Engineering Fair 2014» з 11 па 16 мая ў г. Лос-Анджэлес (штат Каліфорнія, ЗША).

Прыемна адзначыць, што ў выніку ліцэісты БДУ ганараваны дыпламамі пераможцаў конкурсу «Belarus Science and Engineering Fair». Адзінаццацікласнікі *Андрэй Ільін і Уладзіслаў Паўловіч* узнагароджаны дыпломам I ступені ў секцыі «Інфарматыка». Дыпломам гэтай жа ступені ацэнена даследаванне *Івана Саечнікава* (10 клас) у секцыі «Праектаванне: электратэхніка і механіка». Акрамя таго, ён ганараваны адмысловым прызам Ельскай навукова-інжынернай асацыяцыі (ЗША). У секцыі «Фізіка» сваю працу прадставіла адзінаццацікласніца *Юлія Людчык*. Яна была ўзнагароджана дыпломам II ступені.

**Арцём ГУЦУЛЮК**

СУПРАЦОЎНІЦТВА

# Сустрэчы на Эльбе

**У студзені пры спрыянні пасольства Рэспублікі Беларусь у ФРГ адбыўся візіт дэлегацыі БДУ ў Германію.**

Прарэктар па навучальнай рабоце Аляксей Данільчанка, дэкан ФМА Віктар Шадурскі і дырэктар Інстытута нямецкіх даследаванняў Уладзімір Ціханаў наведалі Вольны ўніверсітэт Берліна, Берлінскі ўніверсітэт імя Гумбальта і Патсдамскі ўніверсітэт. Бакі абмеркавалі сумеснае правядзенне міжнародных семінараў і канферэнцый, а таксама дамовіліся пра абмен студэнтамі і выкладчыкамі.

Дэлегацыя БДУ наведала таксама Цэнтр Бертальда Бейца Германскага таварыства па знешняй палітыцы, дзе правяла перамовы з дырэктарам цэнтра доктарам Эвальдам Бёльке. Гаворка ішла пра сумеснае правядзенне даследаванняў і экспертызу ў сферы міжнароднай дзейнасці, падрыхтоўку інфармацыйна-аналітычных матэрыялаў па пытаннях знешняй палітыкі дзвюх краін. Пачаткам супрацоўніцтва стала дамоўленасць пра абмен навуковымі перыядычнымі выданнямі. Бібліятэцы Германскага таварыства па знешняй палітыцы перададзены нумары «Часопіса міжнароднага права і міжнародных адносін», які выпускае ФМА. У сваю чаргу беларускім гасцям былі ўручаныя некалькі асобнікаў часопіса «Міжнародная палітыка» (Internationale Politik), які выдаецца нямецкай установай.

Наступным этапам супрацоўніцтва стане сумесная арганізацыя міжнароднай канферэнцыі, якая пройдзе ўвесну гэтага года на базе БДУ. Форум будзе прысвечаны перспектывам развіцця сучасных гарадоў. У ім прыме ўдзел дырэктар вышэйназванага цэнтра Эвальд Бёльке.

**Ксенія КАРАВАЯ**

НАШЫ ЮБІЛЯРЫ

**04 лютага Ціток Марына Аляксееўна,** прафесар кафедры мікрабіялогіі

**05 лютага Гадуноў Валерый Мікалаевіч,** дырэктар установы адукацыі «Інстытут перападрыхтоўкі і павышэння кваліфікацыі суддзяў, супрацоўнікаў пракуратуры, судоў і ўстаноў юстыцыі БДУ»

**05 лютага Ляхоўскі Уладзімір Віктаравіч,** дацэнт кафедры мытнай справы

**07 лютага Садоўскі Антон Паўлавіч,** прафесар кафедры дыферэнцыяльных ураўненняў і сістэмнага аналізу

**07 лютага Мядзянік Уладзімір Ільіч,** дацэнт кафедры этналогіі, музеялогіі і гісторыі мастацтва

**09 лютага Далгарукава Ала Іванаўна,** дацэнт кафедры англійскай мовы гуманітарных факультэтаў

**10 лютага Яканюк Данат Лявонцьевіч,** дацэнт кафедры тэлебачання і радыёвяшчання

**10 лютага Навуменка Павел Іванавіч,** дацэнт кафедры беларускай літаратуры і культуры

**16 лютага Сяргеева Вольга Валер'еўна,** дацэнт кафедры неарганічнай хіміі

**17 лютага Бялько Ала Аляксееўна,** дацэнт кафедры тэлебачання і радыёвяшчання

**17 лютага Янушэвіч Іван Іванавіч,** намеснік дэкана па вучэбна-выхаваўчай рабоце гуманітарнага факультэта

**20 лютага Карбалевіч Ніна Аляксандраўна,** дацэнт кафедры энергафізікі

**20 лютага Захараў Аляксандр Георгіевіч,** начальнік упраўлення падрыхтоўкі кадраў вышэйшай кваліфікацыі

**21 лютага Саечнікаў Уладзімір Аляксеевіч,** загадчык кафедры фізікі і аэракасмічных тэхналогій

**22 лютага Цэхавая Таццяна Вячаславаўна,** дацэнт кафедры тэорыі верагоднасцяў і матэматычнай статыстыкі

**25 лютага Лаеўская Алена Уладзіміраўна,** дацэнт кафедры грамадзянскага права

*Спіс усіх імяніннікаў размешчаны на сайце БДУ www.bsu.by у раздзеле «Нашы юбіляры».*

**Паводле інфармацыі ўпраўлення кадраў БДУ**

КОНКУРСЫ

## Конкурс на суісканне прэмій імя У. І. Пічэты і А. Н. Сеўчанкі абвешчаны ў БДУ.

Сёлета ён пройдзе ў намінацыі «Адукацыя».

**Дакументы падаюцца ў Галоўнае ўпраўленне навукі (вул. Бабруйская, 9, каб. 401) да 30 красавіка.** Вынікі будуць падведзеныя ў канцы верасня. Запрашаюцца навукоўцы і дадаткова на агульных падставах маладыя навукоўцы (дактары навук ва ўзросце да 45 гадоў, кандыдаты навук – да 35 гадоў, навукоўцы без ступені – да 30 гадоў). Прэміі ў намінацыі «Адукацыя» прысуджаюцца за выбітныя дасягненні ў распрацоўцы новых адукацыйных тэхналогій, якія істотна павышаюць узровень падрыхтоўкі спецыялістаў, за стварэнне падручнікаў, навучальных дапаможнікаў і абсталявання.

Прымаюцца працы як асобных аўтараў, так і выканаўчых калектываў. Колькасць суаўтараў не можа быць большая за чатыры чалавекі. Вынікі першага тура конкурсу будуць асветленыя ў газеце «Універсітэт». Акрамя таго, суіскальнікі, якія прайшлі ў другі тур, маюць права апублікаваць свае навуковыя працы на старонках універсітэцкай газеты.

**Дадатковая інфармацыя па тэл. 209-53-92 і на сайце БДУ ў раздзеле «Навука» (http://www.bsu.by/main.aspx?guid=13031).**

АБ'ЯВЫ

**БЕЛАРУСКІ ДЗЯРЖАЎНЫ ЎНІВЕРСІТЭТ**
**АБ'ЯЎЛЯЕ КОНКУРС НА ЗАМЯШЧЭННЕ ПАСАД**

ЗАГАДЧЫКАЎ КАФЕДРАЎ: інавацыйнага менеджменту, міжнароднага менеджменту, вэб-тэхналогій і камп'ютарнага мадэлявання, дыферэнцыяльных ураўненняў і сістэмнага аналізу,

ПРАФЕСАРАЎ КАФЕДРАЎ: аналітычнай хіміі, агульнай фізікі, фізікі цвёрдага цела, міжнародных адносін,

ДАЦЭНТАЎ КАФЕДРАЎ: інавацыйнага менеджменту, тэорыі функцый, вышэйшай алгебры і абароны інфармацыі, матэматычнай кібернетыкі, нелінейнага аналізу і аналітычнай эканомікі, вэб-тэхналогій і камп'ютарнага мадэлявання, неарганічнай хіміі, радыяцыйнай хіміі і хіміка-фармацэўтычных тэхналогій, інтэлектуальных сістэм, фізічнай электронікі і нанатэхналогій, біяфізікі, вышэйшай матэматыкі і матэматычнай фізікі, гісторыі беларускай мовы, міжнародных адносін, англійскай мовы эканамічных спецыяльнасцяў, тэорыі і методыкі выкладання рускай мовы як замежнай, міжнародных эканамічных адносін, лазернай фізікі і спектраскапіі, агульнай фізікі, фізікі паўправаднікоў і нанаэлектронікі, энергафізікі,

СТАРШЫХ ВЫКЛАДЧЫКАЎ КАФЕДРАЎ: міжнароднага менеджменту, эканамічнай інфарматыкі, вэб-тэхналогій і камп'ютарнага мадэлявання, агульнай матэматыкі і інфарматыкі, дыферэнцыяльных ураўненняў і сістэмнага аналізу, аналітычнай хіміі, арганічнай хіміі, фізічнага выхавання і спорту, беларускай літаратуры і культуры, гісторыі беларускай літаратуры, прыкладной лінгвістыкі, англійскага мовазнаўства, нямецкага мовазнаўства, тэарэтычнага і славянскага мовазнаўства, рускай літаратуры, раманскага мовазнаўства, тэорыі і методыкі выкладання рускай мовы як замежнай, англійскай мовы эканамічных спецыяльнасцяў, англійскай мовы гуманітарных спецыяльнасцяў, германскіх моў, агульнай фізікі, крыніцазнаўства,

ВЫКЛАДЧЫКАЎ КАФЕДРАЎ: інавацыйнага менеджменту, міжнароднага менеджменту, крымінальнага права,

АСІСТЭНТАЎ КАФЕДРАЎ: бія- і нанамеханікі, інтэлектуальных сістэм.

*Тэрмін конкурсу – адзін месяц з дня апублікавання аб'явы.*
*Адрас: 220030, г. Мінск, вул. Бабруйская, 5а,*
*упраўленне кадраў, тэл. 209-54-36.*

**ДЗЯРЖАЎНАЯ ЎСТАНОВА АДУКАЦЫІ «ІНСТЫТУТ ТЭАЛОГІІ ІМЯ СВЯТЫХ МЯФОДЗІЯ І КІРЫЛЫ» БДУ**
**АБ'ЯЎЛЯЕ КОНКУРС НА ЗАМЯШЧЭННЕ ПАСАДЫ**

ДАЦЭНТА кафедры багаслоўя
*Тэрмін конкурсу – адзін месяц з дня апублікавання.*
*Адрас: 220030, г. Мінск, пр. Незалежнасці, 24, тэл. 289-11-63.*

**ДЗЯРЖАЎНЫ ІНСТЫТУТ КІРАВАННЯ І САЦЫЯЛЬНЫХ ТЭХНАЛОГІЙ БДУ**
**АБ'ЯЎЛЯЕ КОНКУРС НА ЗАМЯШЧЭННЕ ПАСАДЫ**

ЗАГАДЧЫКА НАВУКОВА-ДАСЛЕДЧАЙ ЛАБАРАТОРЫІ сацыялагічных і маркетынгавых даследаванняў (1).
*Тэрмін конкурсу – адзін месяц з дня апублікавання аб'явы.*
*Адрас: 220004, г. Мінск, вул. Шпалерная, 7, Дзяржаўны інстытут кіравання і сацыяльных тэхналогій БДУ, аддзел кадраў, тэл. 306-00-28.*

## БДУ Ў СМІ БЕЛАРУСІ

**Інтэрв'ю рэктара БДУ акадэміка Сяргея Абламейкі –** «Рэспубліка», respublika.info, 21.by (06.02), onliner.by (07.02), generation.by (10.02).

**Каманда ліцэістаў БДУ заваявала другое месца на X Міжнароднай Жаўтыкоўскай алімпіядзе школьнікаў па матэматыцы, фізіцы і інфарматыцы** – megacat.by (19.01), БелТА, novostimira.com, belport.by, n1.by (20.01), rsslenty.ru, радыё «Беларусь», kv.by (21.01), XChat.kz, inform.kz, thenews.kz, 212.154.160250/rus/article/2623391 (22.01), «Настаўніцкая газета» (28.01).

**Правядзенне ў БДУ інтэрнэт-фотаконкурсу «Да БДУ з любоўю»** – popal.by, onliner.by (24.01), «Звязда» (30.01).

**Званне «Ганаровы прафесар Маскоўскага дзяржаўнага ўніверсітэта імя М. В. Ламаносава» прысвоена рэктару БДУ акадэміку Сяргею Абламейку** – megacat.by (27.01), kv.by (28.01).

**Алімпіяда «Абітурыент ММФ–2014» на механіка-матэматычным факультэце БДУ** – interfax.by, megacat.by (29.01), «Настаўніцкая газета» (06.02).

**Перамога пяцікурснікаў Інстытута журналістыкі БДУ Дзяніса Мароза і Дзяніса Кобцава ў першым конкурсе сцэнараў «Галоўпітчынг»** – megacat.by (06.02), БелТА, interfax.by (07.02), «Звязда» (11.02), zn.by (14.02).

**Пра міжнародны семінар «Эразмус Мундус» як каталізатар інтэрнацыяналізацыі: абмен найлепшым вопытам і выяўленне новых перспектыў», які прайшоў у БДУ** – АНТ, tvr.by, БелТА (10.02), interfax.by. marketing.by, regnum.ru (11.02), «Звязда» (13.02), megacat.by (14.02).

**Ліцэісты БДУ сталі прызёрамі Балтыйскага навукова-інжынернага конкурсу** – БелТА, Tut.by (14.02), kv.by (17.02)

**Тыдзень беларускай мовы прайшоў у БДУ** – БелаПАН, 21.by (18.02), megacat.by (19.02).

**Ліцэісты БДУ сталі фіналістамі Вышэйшай лігі інавацыйнага адукацыйнага конкурсу «CanSat»** – БелТА, zn.by (14.02).

**Паводле інфармацыі прэс-службы БДУ**

СПАРТПЛЯЦОЎКА

# БДУ ў МСБЛ: «Мы паказалі сябе годна…»

**Каманда БДУ па баскетболе ў чарговы раз заявіла пра сябе ў Міжнароднай студэнцкай баскетбольнай лізе (МСБЛ).** Паспяхова выступіўшы ў першым туры дывізіёна «Прыбалтыка», хлопцы прадставілі наш універсітэт 8 снежня 2013 г. на гульні ў Гродне, а 13–14 – у Рызе.

По выніках трох тураў баскетбалісты БДУ заваявалі 3 месца ў групе. У паядынку з камандай Гродзенскага ўніверсітэта мы двойчы абыгралі суперніка. На рыжскай арэне верх узялі гаспадары – каманды Латвійскага ўніверсітэта і Школы бізнесу Турыба.

– Мы паказалі сябе годна, улічваючы, што за латвійскія каманды выступаюць прафесійныя баскетбалісты, а каманда гродзенскага ўніверсітэта з’яўляецца базавай для клуба вышэйшай лігі «Прынёманне», – гаворыць галоўны трэнер каманды БДУ Дзмітрый Навіцкі. Было нялёгка, узровень



*Дзмітрый Навіцкі з алімпійскім чэмпіёнам Сяргеем Тараканавым у Бялградзе*

супернікаў адчуваўся на працягу ўсіх сустрэч, ні адной гульні не было прахадной. Але нашы хлопцы не збаяліся і змагаліся ў кожным матчы да апошняга.

Зусім нядаўна, 7–8 і 15–16 лютага ў рамках Міжнароднай студэнцкай баскетбольнай лігі (МСБЛ) прайшлі чарговыя гульні. У гэты раз каманда Белдзяржуніверсітэта сустрэлася з Расійскім дзяржаўным універсітэтам фізічнай культуры (РДУФК), з Расійскай прававой акадэміяй Міністэрства юстыцыі РФ (РПА), дзе галоўны трэнер Аляксандр Бялоў, сын легендарнага савецкага баскетбаліста Сяргея Бялова, а таксама з Растоўскім дзяржаўным эканамічным універсітэтам (РДЭУ) і Магнітагорскім дзяржаўным тэхнічным універсітэтам (МДТУ).

Першую сутычку каманда БДУ прайграла РПА з лікам 59:86. У наступнай для перамогі нам не хапіла некалькіх ачкоў. У выніку – 79:81 на карысць каманды РДУФК г. Масква. Але ў наступным хлопцы двойчы ўзялі верх, абыграўшы РДЭУ з лікам 87:61 і МДТУ – 81:80. Прычым у апошняй гульні нашым хлопцам удалося вырваць перамогу за 7 секунд да фінальнай сірэны.

– Удзел у спаборніцтвах міжнароднага ўзроўню мае вялізнае значэнне для развіцця беларускага студэнцкага баскетбола. Асабліва прыемна, што першай камандай, якая ўступіла ў МСБЛ ад нашай краіны, стала зборная БДУ, – гаворыць Дзмітрый Навіцкі. – Нам далі магчымасць памерацца сіламі з сапраўды моцнымі супернікамі. Для гульцоў гэтыя спаборніцтвы паслужылі стымулам да далейшага спартыўнага ўдасканалення. З пазіцыі трэнераў задача нашага ўдзелу складалася ў вывучэнні розных гульнявых стыляў, новых тэхніка-тактычных падыходаў і «свежых» гульнявых рашэнняў. Мы разумеем меру адказнасці, выступаючы пад сцягам галоўнай ВНУ краіны, і імкнёмся дасягнуць максімальнага выніку. Таму для нас вельмі важная падтрымка кіраўніцтва ўніверсітэта: рэктара С. У. Абламейкі, першага прарэктара М. А. Журавкова, прарэктара У. В. Суворава, усіх супрацоўнікаў кафедры на чале з У. А. Калядой і спартыўнага клуба БДУ, дырэктарам якога з’яўляецца Аляксей Камінскі.

Каманда ўніверсітэта апроч МСБЛ удзельнічае ў чэмпіянаце Беларусі (1 ліга). Яна лідзіруе і на дадзены момант займае першае месца ў турнірнай табліцы. Адначасова зборная БДУ спаборнічае ў чэмпіянаце г. Мінска сярод ВНУ, дзе таксама ідзе на 1 месцы. Аддадзім належнае трэнерам.

Валодаць мячом хлопцаў вучаць былыя прафесійныя баскетбалісты Дзмітрый Навіцкі і Анатоль Парфіяновіч з 2001 г. Яны ўзгадваюць, што каманда ў розныя часы з’яўлялася ўдзельнікам Вышэйшай лігі чэмпіянату РБ. Трэнеры бачаць развіццё ўніверсітэцкага баскетбола ў прыцягненні маладых і перспектыўных гульцоў з ДЮСШ усёй рэспублікі. Са спартшколамі вядзецца актыўнае супрацоўніцтва. Але наша задача заключаецца ў першую чаргу ў далучэнні моладзі да здаровага ладу жыцця і ў стварэнні іміджу БДУ як спартыўнай навучальнай установы, як спартыўнага брэнда.

Дарэчы, па выніках Міжнароднай студэнцкай баскетбольнай лігі адбіраліся найлепшыя гульцы, і сярод іх праходзяць Матч зорак, які адбудзецца ў Бялградзе. Гульцоў разгрупавалі на «Захад» (краіны былой Югаславіі і Вялікабрытанія) і «Усход» (Расія, Украіна, Беларусь і Прыбалтыка). Перамогу атрымаў «Захад». Ад нашай краіны выступаў студэнт ГрДУ Аляксандр Семянюк, які заваяваў прыз самага каштоўнага гульца матча.

Дзмітрый Навіцкі прысутнічаў на гэтым мерапрыемстве і адзначыў, што там была прадугледжаная насычаная праграма. Удалося пабачыць матчы Еўралігі паміж камандамі бялградскага «Партызана» і клуба «Краснадар» з Расіі, а таксама ветэранаў савецкага і югаслаўскага баскетбола. У гэтыя ж дні праводзіліся семінары для трэнераў і суддзяў МСБЛ.

**Ігар МАТЭЛЕНАК**

ВЕДАЙ НАШЫХ!

# Пракладзеным шляхам да поспеху

**Каманда «БелСат» Ліцэя БДУ** зноў выйшла ў фінал Вышэйшай лігі конкурсу «CanSat у Расіі» і ўлетку ў Дубне запусціць другі спадарожнік.

Гэты папулярны касмічны конкурс для юніёраў праходзіў у студзені ў МДУ імя М. В. Ламаносава. У адборачнай сесіі прынялі ўдзел 30 расійскіх каманд. Беларусь прадстаўляла толькі 1 каманда – якраз ліцэісты БДУ: Дзмітрый Раманавец, Іван Саечнікаў, Уладзіслаў Паўловіч і Мікіта Мішчанка. Нашы хлопцы паспяхова абаранілі сваю навуковую працу на адборачнай сесіі Вышэйшай лігі чэмпіянату праекта «CanSat у Расіі» і атрымалі званні лаўрэатаў, а таксама дыплом 3 ступені.

Нагадаем, запуск свайго пер-



*Ліцэісты БДУ Дзмітрый Раманавец і Іван Саечнікаў падчас абароны касмічнага праекта ў МДУ імя М. В. Ламаносава*

шага спадарожніка ліцэісты БДУ ажыццявілі ў маі 2012 г. Аднак сёлета для ўдзельнікаў Вышэйшай лігі прадугледжаны новыя тэхнічныя патрабаванні. Напрыклад, у хуткім часе камандам будзе прапанавана распрацаваць свой уласны касмічны апарат вагой да 1 кг для запуску ракетай-носьбітам на вышыню ўжо 6 кіламетраў. У найбліжэйшай будучыні не выключаецца і варыянт запуску арыгінальнага спадарожніка з Міжнароднай касмічнай станцыі.

Падкрэслім, па ўмовах праекта 2012 г. каманды дэманстравалі сканструяваныя макеты сапраўднага спадарожніка і станцыю прыёму. Пры гэтым спадарожнік абавязаны мець такія тэхнічныя характарыстыкі, якія забяспечылі б яму паспяховы запуск, вымярэнне, перадачу інфармацыі і прызямленне на парашуце. Акрамя таго, асноўныя кампаненты касмічнага апарата – сістэма электрасілкавання і перадачы тэлеметрычнай інфармацыі, разнастайныя датчыкі – павінны змяшчацца ў бляшанцы з-пад колы. У прыватнасці, у экспертную камісію конкурсу хлопцы павінны былі прадставіць тлумачальную запіску праекта, віртуальную прэзентацыю і сканструяваны імі навучальны спадарожнік. Назва конкурсу невыпадкова складаецца з англійскіх слоў «can» – бляшаны слоік і «sat» – скарачэнні ад слова «satellite», што азначае спадарожнік.

### ДАВЕДКА

Першы конкурс «CanSat» адбыўся ў 1999 г. у ЗША і накіраваны на развіццё цікавасці школьнікаў і студэнтаў да касмічных даследаванняў. У Расіі конкурс стартаваў у 2012 г., кіраўніком праекта стаў касманаўт герой Расіі Аляксандр Лазуткін. У рэалізацыі праекта асноўную ролю іграюць Навукова-даследчы інстытут ядзернай фізікі імя Д. У. Скобельцына МДУ імя М. В. Ламаносава і Мемарыяльны музей касманаўтыкі. Дадзеныя спаборніцтвы вельмі папулярныя таксама ў Еўропе і Японіі.

**Ірына МІРОНАВА**

НЕ ПРАМІНІЦЕ!

**Паважаныя чытачы!** З новага года пачаў дзейнічаць абноўлены сайт газеты «Універсітэт» **www.gazeta.bsu.by.** Там вы зможаце ўбачыць матэрыялы, што не трапілі ў дадзены нумар: артыкул пра тыдзень беларускай мовы на журфаку, інтэрв’ю з канадскім прафесарам Фрэдам Эдлінам, нарыс пра вандроўку студэнтаў БДУ ў кракаўскі Ягелонскі ўніверсітэт і многія іншыя. Акрамя таго, там шмат рознай карыснай інфармацыі, фота, відэа, апытанні. Актуальна! Пазнавальна! Займальна!

Сачыце за падзеямі, а таксама ствараеце іх самі (і з намі☺)!

**Рэдакцыя газеты «Універсітэт»**




УНІВЕРСІТЭТ
**Выдаецца з 1929 года**

Заснавальнік газеты – Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт
Газета ўзнагароджана Ганаровай граматай Вярхоўнага Савета БССР

Выданне зарэгістравана Міністэрствам інфармацыі Рэспублікі Беларусь.
Рэгістрацыйнае пасведчанне № 1082 ад 21 студзеня 2010 года

28 лютага 2014 года
Падпісана да друку 26.02.2014 г.
Зак. ___. Тыраж 1500 экз.
Надрукавана ў РУП «Выдавецкі цэнтр БДУ»
ЛП № 02330/0494178 ад 03.04.2009.
220030, г. Мінск, вул. Чырвонаармейская, 6

**Рэдактар Сяргей Сяргеевіч ШАФАЛОВІЧ**
Карэктар Ганна Яўгенаўна РАК
Адрас рэдакцыі: 220030, Мінск, прасп. Незалежнасці, 4
Прыёмная: вул. Кальварыйская, 9, каб. 102, тэл. 259-70-77,
***e-mail: gazeta@bsu.by; www.gazeta.bsu.by***

БЕЛАРУСКІ ДЗЯРЖАЎНЫ ЎНІВЕРСІТЭТ
ПСІХАЛАГІЧНАЯ СЛУЖБА

**З сям'і пачынаецца жыццё чалавека, яна – крыніца кахання, павагі, схільнасці. Дабрабыт і трываласць сям'і – вось мера развіцця і стабільнасці краіны.** І менавіта таму ў Беларускім дзяржаўным універсітэце была распрацаваная і рэалізоўваецца праграма «Сямейнае выхаванне студэнтаў БДУ». У сённяшнім выпуску бюлетэня Псіхалагічнай службы мы прапаноўваем да ўвагі чытачоў матэрыялы па розных аспектах сямейнага выхавання.

# Яшчэ раз пра сям'ю

У БДУ пастаянна арганізуюцца асветніцкія акцыі, закліканыя **дапамагчы студэнтам павысіць псіхалагічную культуру.** Чаго вартыя папулярныя ў моладзевым асяроддзі тэматычныя мерапрыемствы Псіхалагічнай службы БДУ па праблемах сям'і і шлюбу!

Падчас іх правядзення маладыя людзі вучацца арыентавацца ў асаблівасцях сямейнага ўкладу і каштоўнасцяў. І не толькі. Аналізуючы праблемы маладой сям'і, яны знаёмяцца з такімі актуальнымі пытаннямі, як «псіхалагічная сумяшчальнасць», «адносіны сацыяльнага статусу», «рашэнне канфліктү»... Яны ўдзельнічаюць у семінарах-практыкумах, трэнінгавых модулях, ролевых гульнях. Псіхалагічная служба БДУ надае сур'ёзную ўвагу працы па праграме павышэння статусу і прэстыжу сям'і сярод студэнцкай моладзі.

У гутарцы з начальнікам Псіхалагічнай службы БДУ **Русланам ПАПКОМ** я свядома выключыла пытанні, якія змяшчаюць навуковыя тэрміны і энцыклапедычныя азначэнні.



*Руслан Папок*

***– Руслан Пятровіч, Псіхалагічная служба БДУ створаная ў 2000 годзе. У ёй працуюць выдатныя спецыялісты ў галіне гештальт-тэрапіі, псіхааналізу, коўчынгу. Маецца багаты практычны інструментарый: псіхадыягнастычны рубрыкатар, праграмы трэнінгаў, тэстаў, творчых майстэрняў, семінараў. Здавалася б, для формулы шчасця ўсё ёсць. Аднак праблемы маладых сем'яў з гадамі не змяняюцца.***

– Калі ў агульных рысах, то праблемы маладых сем'яў ва ўсе часы былі падобныя: бытавая неўладкаванасць, матэрыяльная нестабільнасць, жыллёвыя ўмовы і г. д. Але звярніце ўвагу, што названыя, усім зразумелыя і знаёмыя, жыццёвыя «беды» не з'яўляецца вызначальнымі для тых, хто вырашыў стварыць сям'ю. Дадзеныя факт азначае, што існуе штосьці іншае, не заўсёды матэрыяльнае, што падштурхоўвае нас да стварэння сям'і. Бо сям'я – гэта каханне, дзе ёсць незаменная ўзаемная падтрымка, даверныя адносіны, пасыл дабра ў кожным жэсце... І многае, многае іншае, што робіць нас, людзей, шчаслівымі.

***– Існуе меркаванне, што ключавая праблема ўпіраецца ў ролю мужчыны. Пракаментуйце, калі ласка.***

– Гэта стэрэатып. Асабліва ва ўмовах сучаснай арганізацыі жыцця чалавека. Гэта раней мужчына быў «паляўнічы-здабытчык», а жанчына – «захавальніца хатняга ачага». Зараз гэтыя паняцці размытыя і нярэдка жанчына зарабляе, а мужчына вядзе хатнюю гаспадарку. Але ролі і адносіны ўсё ж застаюцца ранейшымі, а ў падрабязнасцях і дэталях трэба разбірацца – або самастойна, або можна разам з намі на нашых занятках.

***– Як вядома, навучыць дзяцей каханню бацькі могуць толькі тады, калі яны самі ў шлюбе ўмелі кахаць. Адкуль жа бярэцца слынная матывацыя?***

– Вядома, самы лепшы аргумент – гэта ўласны прыклад. Але акрамя гэтага вельмі важна гаварыць з дзіцём, вучыць яго разважаць і разумець жыццёвыя каштоўнасці. Як гэта рабіць? Зноў жа гэта адна з тэм нашых заняткаў.

**Жанна ВАСАНСКАЯ**



*Пераможцы конкурсу «Найлепшая студэнцкая сям'я БДУ»*

ВАША ПЫТАННЕ – НАШ АДКАЗ!

# СЯМ'Я, КАХАННЕ, АДНОСІНЫ

На мерапрыемствах псіхалагічнай службы студэнты ўніверсітэта маюць магчымасць **задаць спецыялістам актуальныя пытанні рознай тэматыкі.** У гэтым артыкуле – некалькі каментароў пра адносіны. Спадзяёмся, яны будуць цікавыя нашым чытачам.



**• Як знайсці агульную мову з бацькамі?**

Пра тое, што прадстаўнікі розных пакаленняў не заўсёды разумеюць адзін аднаго, вядома спакон веку. І гэта нармальна хоць бы таму, што дзеці і бацькі – розныя з прычыны свайго ўзросту, жыццёвага вопыту і многіх іншых умоў. Дзеці незадаволеныя тым, што іх кантралююць, не прызнаюць за імі права рабіць памылкі і атрымліваць асабісты вопыт. Бацькі трывожацца, крыўдзяцца, таму што да іх не прыслухоўваюцца, не разумеюць іх добрых намераў, імкнення перасцерагчы дзяцей ад памылак, якія яны здзейснілі самі. Бацькі пачынаюць адчуваць бездапаможнасць і адрынутасць, а дзецям здаецца, што ім не давяраюць. З часам дадзеная сітуацыя, як снежны ком, пачынае абрастаць новымі крыўдамі і негатыўнымі пачуццямі.

Паспрабуйце ўзвысіцца над сітуацыяй у вашай сям'і і паглядзець на яе як бы з боку. Такі падыход дае магчымасць убачыць, што стаіць за негатыўнымі пачуццямі і ўзаемнымі прэтэнзіямі. Часцей за ўсё аказваецца, што мы чакаем адзін ад аднаго кахання, прыняцця і падтрымкі, але толькі даём гэта не ў той форме, у якой ад нас таго чакаюць і могуць атрымаць.

А калі бацькі праз нейкія фактары застаюцца непахіснымі, рабіце самі першыя крокі насустрач, бо вы больш маладыя, гнуткія і адаптыўныя. Вам будзе прасцей.

**• Як перажыць расстанне з хлопцам? Нашы адносіны доўжыліся 4 гады.**

Абарваныя адносіны прыносяць пакуты. Пры разрыве мы шкадуем не толькі пра тое, што было, але і пра тое, што б магло быць, але цяпер ужо не адбудзецца. Гэтую страту неабходна прызнаць і аплакаць. Дайце свайму смутку час, каб аддзяліць мінулае ад гэтага. Тады з'явіцца магчымасць зазірнуць у будучыню. Каб перажыць боль, паспрабуйце адцягнуць увагу, акунуцца ў вучобу або працу, вырашайце канкрэтныя задачы, сустракайцеся з сябрамі. Адначасова працуйце над павышэннем самаацэнкі, успамінайце поспехі, стаўце новыя мэты. Паступова, крок за крокам, у жыццё пачне вяртацца сэнс, з'явяцца новыя магчымасці і сілы. Перажыўшы крызіс і зрабіўшы «працу над памылкамі», у новае каханне мы прыходзім ужо больш моцнымі і мудрымі.

**• Ёсць меркаванне, што каханне жыве тры гады. Як захаваць адносіны доўгі час?**

Ідэя, што можна выратаваць адносіны, выкарыстоўваючы шэраг інструкцый, вельмі прывабная. Ёсць цэлы спіс таго, што партнёры «павінны», калі хочуць жыць доўга і шчасліва: не спрабаваць адзін аднаго перавыхоўваць, абмяркоўваць свае адносіны, падтрымліваць сябе ў тонусе, не «раствараціца» ў партнёру... Гэта ўсё, вядома, добра і карысна. Да гэтых парадаў можна і трэба прыслухоўвацца, але выкананне правіл не гарантуе стопрацэнтнага дасягнення выніку. У тэорыі проста, а жыццё не заўсёды ўпісваецца ў рамкі і стандарты.

Кожная пара здольная стварыць уласную формулу кахання і прыдумаць правілы гульні. Жывіце і атрымлівайце асалоду ад адносінаў тут і цяпер, без рэцэптаў і гатовых інструкцый. І вы зможаце даказаць, што вашы адносіны жывуць нашмат даўжэй, чым тры гады.

**СВАЕ ПЫТАННІ ВЫ МОЖАЦЕ ЗАДАЦЬ ПСІХОЛАГАМ**
**па тэлефонах (017) 209 56 07, 259 70 61,**
**або ў нашай групе «Псіхалагічная служба БДУ» ў сетцы vk.com.**

## ПСІХАЛАГІЧНЫ ТЭСТ

# З дапамогай гэтага тэсту Вы даведаецеся, **гатовыя Вы да сямейнага жыцця** або Вам не варта спяшацца са шлюбам



**Адкажыце на пытанні і сцвярджэнні. Адказвайце хутка, без ваганняў «так», «не» ці «часам».**

| № | Пытанне | так | не | часам |
|---|---|---|---|---|
| 1 | Ці згодныя вы са сцвярджэннем, што сям'я і сямейныя адносіны важнейшыя за сяброўства, сяброў і прыяцельскія адносіны? | 2 | 0 | 1 |
| 2 | Ці лічыце вы, што вам варта працягнуць працу па спецыяльнасці пасля шлюбу? | 2 | 0 | 1 |
| 3 | Ці не падаецца вам, што сям'я без дзяцей што дом без гаспадара? | 2 | 0 | 1 |
| 4 | Усе вашыя знаёмыя хваляць прыгатаваныя вамі стравы? | 2 | 0 | 1 |
| 5 | У будучыні вы збіраецеся дзяліцца з партнёрам усімі сваімі таямніцамі і сакрэтамі? | 2 | 0 | 1 |
| 6 | Ці думаеце вы, што шлюб вашых бацькоў атрымаўся? | 2 | 0 | 1 |
| 7 | Вы ўхваляеце ідэю так званага «пробнага шлюбу»? | 0 | 2 | 0 |
| 8 | Ці лічыце вы дашлюбныя сувязі заганнымі і недапушчальнымі? | 2 | 0 | 0 |
| 9 | Ці гатовыя вы дараваць здраду вашаму партнёру? | 2 | 0 | 1 |
| 10 | Ці можаце вы сцвярджаць, што паблажліва і памяркоўна ставіцеся да недахопаў іншых? | 2 | 0 | 1 |
| 11 | Ці гатовыя вы падзяляць захапленні вашага партнёра? | 2 | 0 | 1 |
| 12 | Ці схільныя вы перабольшваць вартасці тых, каго кахаеце? | 2 | 0 | 1 |
| 13 | Ці думаеце вы, што праца вашага партнёра будзе менш важная, чым ваша? | 0 | 2 | 0 |
| 14 | Ці ўпэўненыя вы ў тым, што клопат пра паўсядзённыя дробязі будзе прыносіць вам задавальненне? | 2 | 0 | 1 |
| 15 | Калі з вамі абыходзяцца ветліва і далікатна, то вы можаце саступіць? | 2 | 0 | 1 |
| 16 | Ці заўсёды вы сапраўды ведаеце, што хвалюе вашага партнёра ў дадзены момант? | 2 | 0 | 1 |
| 17 | Ці часта выклікаюць ваша раздражненне асобныя звычкі партнёра? | 0 | 2 | 0 |
| 18 | Ці бывае вам цяжка мець зносіны з бацькамі вашага партнёра? | 0 | 2 | 0 |
| 19 | Пры размове пра дзяцей вы грэбліва моршчыцеся ці пераводзіце размову на іншую тэму? | 0 | 2 | 0 |
| 20 | Вы і дня не можаце пражыць адзін без аднаго? | 2 | 0 | 1 |
| 21 | Вы шчырыя з партнёрам пры размовах пра ўласныя праблемы і недахопы? | 2 | 0 | 1 |
| 22 | Ці лічыце вы, што ваш партнёр мог бы быць трохі прыгажэйшым і разумнейшым? | 2 | 0 | 1 |
| 23 | Вам прасцей уявіць сваю будучыню без кар'еры, чым без сям'і? | 2 | 0 | 1 |
| 24 | Ці не падаецца вам, што вы сур'ёзна задумаліся пра шлюб толькі пасля таго, як мама ўхваліла ваш выбар? | 0 | 2 | 0 |
| 25 | Ваша гармонія даходзіць да таго, што вы аднолькава ацэньваеце ўчынкі вашых сяброў і знаёмых? | 2 | 0 | 1 |
| 26 | Ці не выклікае ў вас раздражненне імкненне партнёра падабацца не толькі вам? | 0 | 2 | 0 |



### ВЫНІКІ ТЭСТУ

**0 – 20 балаў** – негатоўнасць да шлюбу.
**21 – 38 балаў** – частковая гатоўнасць да сямейнага жыцця.
**39 – 52 балы** – гатоўнасць да шлюбу.
Калі вынікі тэсту засмуцілі вас, не хвалюйцеся. Магчыма, вам проста не хапае даверу да партнёра і жыццёвага вопыту. Усё ў вашых руках!

# УВАГА! УВАГА!
## Не спазніцеся на рамантычны конкурс!!!



Калі дні становяцца даўжэйшымі, птушкі спяваюць радасней і гучней, а ранішняе паветра напоўнена пахам адталай зямлі, значыць, набліжаецца вясна і конкурс **«НАЙЛЕПШАЯ СТУДЭНЦКАЯ СЯМ'Я БДУ».**

* * *

Мэта конкурсу – павышэнне прэстыжу студэнцкай сям'і як найважнейшага сацыяльнага інстытута ў сучасным грамадстве, а таксама адраджэнне традыцый і развіццё сямейных каштоўнасцяў, накіраваных на паляпшэнне дэмаграфічнай сітуацыі ў краіне.

* * *

Конкурс будзе праходзіць у тры этапы з лютага па май 2014 года.

Запрашаем студэнцкія сем'і прыняць удзел у конкурсе!

**Па пытаннях удзелу звяртацца па тэлефонах 259 70 61, (029) 655 17 66, (029) 541 50 75 або па электроннай пошце CPD@tut.by.**

## АПЫТАННЕ

# У сям'і жыць – шчаслівым быць!

**Ці хочуць студэнты ўніверсітэта заключаць шлюб?** Якімі бацькамі яны сябе бачаць? Гэтыя і многія іншыя пытанні спецыялісты псіхалагічнай службы задавалі студэнтам падчас сацыяльна-псіхалагічнай акцыі, праведзенай у снежні 2013 года. Мы высветлілі, што:




• аптымальным для стварэння сям'і студэнты лічаць узрост 20–25 гадоў, прычым пажаданы так званы «пробны шлюб» (дашлюбнае сужыццё з наступным заключэннем афіцыйнага шлюбу);

• узровень сваіх ведаў, уменняў і навыкаў па стварэнні сям'і і выхаванні дзяцей дзяўчаты ацэньваюць як сярэдні, юнакі – як досыць нізкі;

• у галіне выхавання юнакоў і дзяўчат у аднолькавай ступені цікавіць пытанне пра ролю бацькі і маці да і пасля нараджэння дзіцяці;

• маладыя людзі хочуць самастойнасці і, ажаніўшыся, аддаюць перавагу жыць асобна, а не з бацькамі.

У народзе кажуць: «Кветкам патрэбна сонца, а чалавеку – сям'я». Сям'я, шлюб, дзеці – каштоўнасці, неабходныя ў любыя часы. Гэта справядліва і правільна для студэнтаў нашага ўніверсітэта.

# Вясельны тлумачальны слоўнік



## Якія вясельныя даты вы ведаеце?

Большасць, не задумваючыся, назаве сярэбранае і залатое вяселле. Хтосьці ўзгадае рубінавае або дыяментавае. Аднак не ўсе вясельныя юбілеі маюць «ювелірнае» адценне. Яны могуць быць чыгуннымі і драўлянымі, карункавымі і бляшанымі, рабінавымі і ландышавымі.

У Беларусі юбілейныя гадавіны вяселля сталі адзначаць з канца XIX стагоддзя заможныя гараджане, у якіх было дастаткова часу і сродкаў для правядзення падобных святаў. З часам гэтая традыцыя распаўсюдзілася і на іншыя слаі грамадства. Асабліва маштабнае распаўсюджванне традыцыі святкавання вясельных дат у Беларусі прыпадае на канец 80-х гадоў XX стагоддзя. У СССР юбіляраў 25-й, 50-й, 65-й гадавіны вяселля ўшаноўвалі ў аддзелах ЗАГС.

Такім чынам, якія бываюць вяселлі? Раскажам пра асноўныя з іх.

**Дзень вяселля – ЗЯЛЁНАЕ вяселле.** Нараджэнне сям'і. Самы першы юбілей. Зялёнае вяселле святкуецца на працягу першага года пасля заключэння шлюбнага саюза кожны месяц у дзень вяселля. Звычайна ў якасці падарунка дораць толькі кветкі, звяртаючы ўвагу на тое, колькі яны прастаяць.

**1 год – ПАРКАЛЁВАЕ вяселле.** Азначае пераход ад навісны мядовага месяца да паўсядзённых адносін. У гэты дзень маладыя абменьваюцца паркалёвымі хустачкамі.

**5 гадоў – ДРАЎЛЯНАЕ вяселле.** Сувязь назвы з дрэвам як сімвалам жыцця, цвіцення і ўрадлівасці паказвае, што да пяці гадоў сумеснага жыцця павінен нарадзіцца першынец, а муж і жонка «прырасці адзін да аднаго каранямі», нібы дрэвы, бо нішто так не звязвае і не ўмацоўвае сямейнае жыццё, як нараджэнне дзіцяці. У гэты дзень прынята дарыць драўляныя штучкі.

**10 гадоў – РУЖОВАЕ (алавянае) вяселле.** Трываласць сямейнай сувязі на 10 гадавіну вяселля лічыцца непарушнай. «Алавяную» назву гэтага юбілею звязваюць з гнуткасцю металу волава, гэта значыць з уменнем мужа і жонкі падладжвацца адзін да аднаго. Падарункі ў гэты дзень павінны быць такія ж прыгожыя, як адносіны мужа і жонкі, якія вытрымалі 10 гадоў. Муж дорыць жонцы 11 руж: 10 чырвоных – як сімвал кахання і 1 белую – як сімвал надзеі на будучыню.

**15 гадоў – КРЫШТАЛЬНАЕ (шкляное) вяселле.** Крышталь, звонкі і чысты, сімвалізуе чысціню і празрыстасць шлюбных адносінаў. Найлепшыя падарункі – разнастайныя вырабы з крышталю і шкла. Застолле, па звычаі, працягваецца да таго часу, пакуль хтосьці спецыяльна не разаб'е чарку, келіх або талерку.

**20 гадоў – ФАРФОРАВАЕ вяселле.** Фарфор – тонкі, лёгкі, вытанчаны і далікатны матэрыял. Таму і да 20-й гадавіны шлюбу варта ставіцца сур'ёзна: калі муж і жонка не будуць асцярожныя, ён можа разбіцца. У гэты дзень на святочны стол выстаўляецца новы фарфоравы посуд, бо лічыцца, што за 20 гадоў з дня вяселля ўвесь падораны да вяселля посуд разбіўся.

**25 гадоў – СЯРЭБРАНАЕ вяселле.** Сямейны саюз высакародны і ўстойлівы, як гэты метал. Існуе традыцыя апранаць у гэты дзень побач з залатым заручальным пярсцёнкам яшчэ і сярэбраны. Госці даюць мужу і жонцы падарункі з серабра.

**30 гадоў – ЖАМЧУЖНАЕ вяселле.** Натуральны жэмчуг з'яўляецца сімвалам чысціні і бездакорнасці адносін мужа і жонкі. Муж дорыць жонцы каралі з трыццаці жамчужын, што сімвалізуе трыццаць пражытых разам гадоў. Кожны год каштоўны і прыгожы, як жамчужына.

**35 гадоў – ПАЛАТНЯНАЕ (каралавае) вяселле.** Палатно сімвалізуе трываласць, свет, дабрабыт і ўтульнасць. А карал мае ўласцівасць хутка разрастацца і ўтвараць каралавыя рыфы. Таму на каралавае вяселле ў маладых ужо павінна быць вялікая сям'я з мноствам унукаў.

**40 гадоў – РУБІНАВАЕ вяселле.** Сімвал вяселля – рубін – камень кахання, агню і вечнага пачуцця, якое палае і не згасне ніколі, бо ўжо праверанае часам. Яго колер – колер крыві, а значыць, і адносіны паміж мужам і жонкай «крэўныя». Па цвёрдасці рубін падобны да алмазу, і лічыцца, што ніякія выпрабаванні ўжо не могуць раскалоць сям'ю.

**45 гадоў – САПФІРАВАЕ вяселле.** Сімвал гадавіны – сапфір, камень кахання, які абараняе ад зла, камень абнаўлення і дабрыні. Дзякуючы яму адносіны паміж мужам і жонкай становяцца як быццам новымі, свежымі.

**50 гадоў – ЗАЛАТОЕ вяселле.** Золата ўвасабляе тое, што дасягнута нялёгкай працай. Людзі, якія пражылі разам паўстагоддзя, даказалі ўзаемнае каханне, павагу, давер і адданасць. Існуе традыцыя ў дзень залатога вяселля абменьвацца новымі заручальнымі пярсцёнкамі, а старыя аддаць унукам як сямейную рэліквію.

**55 гадоў – ІЗУМРУДНАЕ вяселле.** Назва вяселля звязана з ізумрудам – каменем зялёнага колеру, які сімвалізуе вечнасць жыцця. Свята, прысвечанае гэтай гадавіне, праводзяць для сваіх бацькоў дзеці. Пажаданне да юбілею вяселля – жыць, кахаць і ніколі не старэць.

**60 гадоў – ДЫЯМЕНТАВАЕ вяселле.** Муж і жонка пражылі разам 60 гадоў, выстаяўшы перад бурамі лёсу як самы цвёрды матэрыял – алмаз. Ужо ніхто і нішто не здолее скасаваць такі доўгі шлюб. Муж дорыць жонцы ўпрыгажэнні з дыяментам.

**65 гадоў – ЖАЛЕЗНАЕ вяселле.** Сімвал гадавіны – жалеза, якое сімвалізуе моцныя адносіны, даказаныя доўгімі гадамі. На жалезнае вяселле мужам дораць невялікія жалезныя фігуркі, падстаўкі, рамкі і да таго падобныя дробязі.

**70 гадоў – ЖЫВАТВОРНАЕ вяселле.** Гэта вясельны юбілей, калі кідаюць погляд у мінулае і разумеюць: каханне, пасланае небам, – гэта ласка і сапраўднае шчасце. Муж і жонка дзякуюць адзін аднаму за шчаслівы лёс, а іх дзеці, унукі і праўнукі прамаўляюць тосты за здароўе, дораць «падзячныя» падарункі ў знак удзячнасці і клопату пра старэйшых, якія пранеслі каханне адзін да аднаго праз усё жыццё, дзякуюць мужу і жонцы за іх каханне, надзейнасць і цеплыню.

**75 гадоў – КАРОННАЕ вяселле.** Такі працяглы шлюб – сапраўднае дасягненне. На гадавіну дзеці робяць для мужа і жонкі вялікі торт, упрыгожаны лебедзямі, якія схілілі галаву адзін да аднаго. Юбіляры павінны самастойна разрэзаць торт, пачаставаць ім усіх прысутных, а лебедзяў пакінуць сабе і пачаставаць адзін аднаго.

**80 гадоў – ДУБОВАЕ вяселле.** Сімвал гэтай вяселля – дуб, які можа прастаяць цэлае стагоддзе. Гэта магутнае дрэва не баіцца ніякіх ураганаў і бур. Такі юбілей – вельмі рэдкая з'ява і сустракаецца пераважна сярод доўгажыхароў, што і пацвярджае дуб, які таксама з'яўляецца сімвалам вечнасці.

**100 гадоў – КРАСНАЕ вяселле.** Самая немагчымая і нерэальная дата вяселля. Гэта назва з'явілася не так даўно. Прыдумалі яго шчаслівыя Ніфтула і Балабеім Агаевы, якія пражылі разам цэлае стагоддзе. У старыя часы на Русі слова «красны» азначала прыгожы. Прыгожыя і пачуцці, якія вытрымалі выпрабаванне часам.

*Горка!*